ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

Выходзіць тры разы на тыдзень: у чацьвер, пятніцу і нядзелю. | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 903 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, «Чырвонай Зьмены». Менск, Савецкая 63.

№ 70 (305) Пятніца, 18 чэрвеня.

Кіраўніцтва грамадзкімі працаўнікамі

Комсамол Беларусі мае вялікую армію грамадзкіх працаўнікоў.

Пасьля перавыбараў лічыцца комсамольцаў у сельсаветах 1754, у рэвізыйных камісіях сельсаветаў 254, у сельных камітэтах узаемадапамогі 653, упаўнаважаныя камітэтаў узаемадапамогі 696, у праўленьнях спажывецкай кооперацыі 98, у рэвізыйных камісіях 49, у праўленьнях сельска-гаспадарчай і прамысловай кооперацыі 39.

ЦК ЛКСМБ вынесячы рэзолюцыю па вынікам перавыбараў адзначыла, як галоўную задачу—наладжваньне кіраўніцтва грамадзкімі працаўнікамі з боку ячэек і РК КСМ.

Якія практычныя шляхі маюцца тут.

Найбольш важнае значэньне маюць раёныя нарады—пры чым вопыт працы паказвае, што нарады іншы раз далі мала, з той прычыны, што на паведамлены іх ставяцца ў большасьці справаздачы з месцаў, у той час, калі добрыя вынікі можа даць нарада толькі у той час, калі яна пакажа грамадзкім працаўнікам бліжэйшыя конкрэтныя заданьні працы іх організацыі.

Рабячы вывады з гатага, лепш за усё будзе склікаць нараду сельсаветчыкаў, кооператараў,—дзе ставіць ня толькі справаздачы, але і пытаньні бліжэйшай працы.

Напрыклад: на нарадзе сельсаветчыкаў: „заданьні комсамолу ў сел. гаспадарчай падатковай кампаніі на 1926-27 г.“ «Заданьні санітарнай працы ў раёне і ўдзел КСМ у ёй». На нарадзе кооператараў: «заданьні барацьбы за зьніжэньне цэн», малочная кооперацыя і яе заданьні» і г. д.

Вядома, што там, дзе склікаецца нарада партыйцаў, працуючых у грамадзкіх установах—асобыя нарады комсамольцаў не патрэбны.

Дакладчыкамі павінны быць працаўнікі адпаведных дзяржаўных і грамадзкіх устаноў і організацый, каб дырэктывы, якія даюцца комсамольцам-грамадзкім працаўнікам не разыходзіліся з практычнымі планамі працы гэтых організацый.

Нарады не павінны быць частымі; лепш, калі яны будуць склікацца раз у 2-3 месяцы, пры чым павесткі трэба выбіраць якія выходзяць з баявых чарговых задач працы.

У сучасны момант іншае пытаньне,—аб кіраўніцтве ячэйкі.

Дзеля таго, каб ячэйка мела магчымасьць кіраваць працай грамадзкіх працаўнікоў—неабходна і на сходах ячэек ставіць пытаньне аб чарговых заданьнях працы сельсаветаў, спажывецкай кооперацыі, сельска-гаспадарчай кооперацыі, СКГУ.

Перад тым, як заслухоўваць справаздачы комсамольцаў, працуючых у якой небудзь організацыі—трэба раней у раёне ці ў парт'ячэйцы добра высьвятліць, на якія моманты неабходна зьвярнуць галоўную ўвагу, якія практычныя заданьні сельсавету, кооператыву ў гэты час.

Можна практыкаваць такі мэтад—заслухаўшы даклад даручыць распрацаваць рэзолюцыі камісіі, якая, узгодніць рэзолюцыі з кім гэта патрэбна, а за тым зацьвердзіць рэзолюцыю на наступным сходзе.

Бюро ячэйкі павінна праглядаць, як той ці іншы працаўнік выконвае тыя дырэктывы якія дадзены яму сходам на штодзеннай працы, а таксама праглядаць гэта пры наступнай яго справаздачы.

Справаздачы комсамольцаў, асабліва тых, якія знаходзяцца на кіраўнічай працы (старшыні сельсаветаў, старшыні камітэтаў узаемадапамогі) неабходна ставіць на парт'ячэйках, у райкоме партыі.

* * *

Штодзённым партыйным кіраўніцтвам комсамольскімі грамадзкімі працаўнікамі трэба папярэдзіць магчымасьць супроць пастаўленьняў іх партыі, ухіленьня ад правільнай клясавай лініі (падпаданьне пад уплыў кулацтва), а такія выпадкі на перавыбарах, калі асобныя комсамольцы спрабавалі ісьці супроць рашэньняў ячэек партыі і КСМ і пралезьці ў сельсавет, прыстасоўваючыся пад настроі кулацтва—былі.

Такім чынам мы палепшым якасьць працы нашых грамадзкіх працаўнікоў.

По советской стране.

○ 382 крестьянина-выдвиженца работают в настоящее время в органах Наркомзема РСФСР.

○ Комсомольцы Харькова отправили подшефным черноморским морякам несколько ящиков книг, полный набор инструментов для струнного оркестра, фотографические аппараты и другие подарки.

○ 50 новых автобусных линий, протяжением до 5.000 килом., будут открыты текущим летом в 13 округах СССР.

○ Судьба урожая. Состояние озимых, по определению специальной экспертной комиссии, в общем по всему Союзу Республик несколько выше среднего. Положение посевов благоприятное. Засуха им не угрожает, запасы влаги—достаточны.

○ Вязально-чулочная фабрика будет построена текущим летом в Ленинграде.

○ «Час радио». В ближайшее время по воскресным и праздничным дням от 1 ч. до 2 ч. дня будет установлена передача звучных уроков и лекций об установках радио приемников.

○ В селе Подлесном, Тарановского района, на Украине, сход селян решил построить мост своими силами и ассигнованные на его постройку 560.000 рублей—отдать на восстановление какого-либо крупного предприятия.

Комсамол у барацьбе за рэжым экономіі.

(З адозвы ЦК УсеЛКСМ да ўсіх сяброў УсеЛКСМ)

Цэнтральны Камітэт УсеЛКСМ прапануе ўсім організацыям саюзу разгарнуць шырокую кампанію па растлумачваньні, практычнаму ажыцьцяўленьню пастаноў пленуму ЦК УсеКП, які адбыўся ў красавіку м-цы, кіруючыся наступнымі зазначэньнямі:

Растлумачыць і прапрацаваць рэзолюцыю красавіцкага пленуму ЦК УсеКП аб гаспадарчым становішчы і задачах партыі і адозвы ЦК УсеКП і ЦКК УсеКП аб рэжыме экономіі на сходах комсамольскага актыву ў ячэйках саюзу, сходах і конфэрэнцыях рабочай і сялянскай моладзі.

Правесьці кампанію на фабрыках і заводах па падняцьцю вытворчасьці працы сярод моладзі, за барацьбу з прагуламі, неахайнымі адносінамі да працы, матар'ялам і інструмантам пад лёзунгам: „комсамолец—лепшы працаўнік у цэху, лепшы вучань фабзавуча“.

Павялічыць і палепшыць працу комсамольцаў і моладзі ў вытворчых нарадах, усебакова дапамагаючы іх ажыўленьню і зацікаўленасьці маладых рабочых у іх дзейнасьці шляхам абгаворваньня пытаньняў па палепшаньні вытворчай вучобы моладзі падняцьці яе кваліфікацыі і г. д.

Правесьці ў самы блізкі тэрмін у жыцьцё дырэктывы ЦК і зьездаў саюзу аб палепшаньні і аб магчымым пашыраньні фабрычна-заводзкага вучнёўства. Але разам з тым нельга ні ў якім разе дапускаць, скарачэньня агульнай сумы (і без таго нязначнай) сродкаў, якія адпускаюцца на адукацыю рабочай моладзі, імкнучыся шляхам палепшаньня і патаненьня фабрычна-заводзкага вучнёўства, пашыраць кадры той моладзі, якая вучыцца. Трэба памятаць, што выдаткі на падрыхтоўку новых кадраў кваліфікаваных рабочых ёсьць вытворчыя выдаткі.

Вясковыя ячэйкі саюзу павінны разьвіць энэргічную працу па дапамозе кооперацыі, палепшаньні і патаненьню яе апарату шляхам актыўнага ўдзелу ў барацьбе з накладнымі выдаткамі, рабаўніцтвам і бесгаспадарчасьцю.

Н. Чаплін.

Радио-вести.

○ Продолжавшаяся 18 недель забастовка 12.000 меховщиков в Нью-Иорке (Америка) закончилась победой бастующих. Предприниматели согласились на повышение зарплаты и сокращение рабочего дня. Забастовкой руководили революционные вожди профсоюзов.

○ В Берлине происходят аресты коммунистов.

○ Во время недавнего столкновения между полицией и рабочими в Островце (Польша) убито 5 человек и ранено 18.

○ На днях в дайренском суде (Япония) разбиралось дело бывшего офицера царской армии белогвардейца Всеволода Сергеева, похитившего 21-го февраля флаг СССР со здания дайренского консульства. Суд приговорил Сергеева к 4 месячному тюремному заключению.

○ По сообщению из Тетуана (Марокко) племя Ахмеда обезглавило всех назначенных Абд-Эль-Керимом каидов (старшин). Головы казненных выставлены на рыночных площадях.

Рука Москвы.

В действительности...

...И какой ее изображает английская пресса.

Сколько рабочей молодежи учится в университетах

По официальным данным, в 1925-1926 учебном году из 31.300 студентов, обучающихся в прусских высших учебных заведениях, только 425 являются детьми рабочих.

Самоубийство Чхеидзе.

Телеграф принес известие о самоубийстве одного из руководителей грузинской социал-демократии, Карла Чхеидзе.

Это самоубийство нельзя не рассматривать в связи с идейным распадом когда то господствовавшей в Грузии социал-демократической партии. Эта партия была господствующей в Грузии и в тот момент, когда в России торжествовала Октябрьская революция.

Попытка устроить восстание в Советской Грузии была агонией грузинской социал-демократии, которая умирала естественной смертью.

Идейные корни были подорваны. Генеральное разложение этой партии уход из партии почти всех рабочих и крестьян, возвращение в Грузию из эмиграции всех уехавших туда авторитетных рабочих меньшевиков, все это является той основной причиной, которая толкнула одного из генералов грузинской социал-демократии, оставшегося без армии, на самоубийство.

Самоубийство Чхеидзе есть небольшой осколок самоубийства всей грузинской социал-демократии.

РУБЕН.

Убийцы комсомольца приговорены к расстрелу.

ПСКОВ. Вынесен приговор над убийцами комсомольца Яковлева, крестьянина дер. Сидорова, Псковского уезда. Убитый—студент ленинградского университета—вел ответственную работу, в частности антирелигиозную. Убийцы—кулаки Кусалол и Бартнин приговорены к расстрелу.

Вести из Польши.

ВАРШАВА. После некоторого затишья за время майских событий в Польше началось быстрое нарастание забастовочной волны на экономической почве. Со всех концов Польши поступают сведения о забастовках и конфликтах. Забастовочная волна носит обостренный характер ввиду противодействия со стороны предпринимателей, широко использующих локауты.

Как закончилась дуэль.

ВАРШАВА. Во вторник состоялась дуэль на пистолетах между Скшинским и генералом Шептыцким (бывший военный министр). Скшинский вызвал Шептыцкого на дуэль потому, что последний критически отозвался о политической роли Скшинского. Дуэль закончилась следующим: образом: Шептыцкий стрелял но промахнулся, а Скшинский отказался от выстрела.

З матар'ялаў райконфэрэнцый

Агульных вынікаў (з усіх акруг), мы яшчэ ня маем. Гэта есьць матар'ял непасрэднага нагляданьня за ходам некаторых конфэрэнцый, які знаходзіцца з наступаючымі матар'яламі.

Галоўнае, што далі райконфэрэнцыі,—гэта прыцягненьне увагі усей організацыі да пытаньняў гаспадарчых.

У першы раз па агульнаму (на унутрыкомсамольскаму) пытаньню разгарнуліся такія спрэчкі на комсамольскіх конфэрэнцыях.

Конфэрэнцыі паказалі, што у многіх комсамольцаў да гэтага часу ня было яшчэ належнай увагі да гаспадарчых пытаньняў.

На фабрыках, заводах растуць прагулы сярод моладзі, а ячэйкі амаль што не займаліся пытаньнямі падняцця вытворчасьці працы, слабы удзел комсамолу у вытворчых нарадах, на весцы комсамольцы самастойныя гаспадары яшчэ у большасьці не зьяўляюцца прыкладнымі, не праводзяць практычна у жыцьцё тыя культурныя пачынаньні з якімі яны азнаёміліся у сельска-гаспадарчых гуртках. Гэтыя гурткі займаліся амаль што аднэй тэорыяй і з прыходам лета распадаюцца.

Усе-ж некаторыя ячэйкі маюць у грамадзка-гаспадарчай працы значныя дасягненьні.

Есьць ячэйкі, якія організавалі меліорацыйныя таварыствы, малочныя арцелі, якія узялі ініцыятыву у землеўпарадкаваньні, у пераходзе на шматпольле, у ачыстцы насеньня.

Найбольшую актыўнасьць конфэрэнцыі выявілі па справаздачам РК і (на гарадзкіх конфэрэнцыях) па экономічнаму пытаньню.

Галоўнае у спрэчках: неабходнасьць узмацніць жывое, інструкцыйнае кіраўніцтва РК, кіраўніцтва піонэрпрацай, слабая мэтодычная праца з кіраўнікамі гурткоў, школ, недастатковыя пасьпехі, неабходнасьць налепшыць якасьць вечарак, якія праводзяцца ячэйкамі, культдней, сходаў—ячэек.

Амаль што усюды затрымліваліся на тым, што ячэйкі не могуць добра разьмяркоўваць працу, асабліва вялікія, у ячэйках есьць «пасмугныя», якіх лічаць няздольнымі весьці працу. У эконом. працы больш за усе гаварылі аб дрэннай пастаноўцы справы вучнёўства, аб тым, што падросткі, якія лічацца па броні, скарыстоўваюць на чорнай працы, што вучні затрымліваюцца у ніжэйшых разрадах, гаварылі аб непаразуменьнях у адносінах майстроў і вучняў, аб непаразуменьні узаемаадносін комсамолу з профсоюзамі у экономічнай працы, аб неналаджанасьці працы сярод батрацтва. Эконом. пытаньне на гарадзкіх конфэрэнцыях займала галоўнае месца.

Пытаньні далейшай працы прашлі вяла, бо конфэрэнцыі запіналіся амаль што да начы.

Выбары райкомаў праходзілі у поўнай меры дэмократычна, галасаваньне было пэрсональнае (з асобнымі выключэньнямі—па настаяньню дэлегатаў). Склад РК раней абгаварваўся актывам, на ячэйках, кустовых сходах.

Як некаторымі памылкамі трэба яшчэ адзначыць, што у некаторых мясцох, пры выбарах дэлегатаў на конфэрэнцыі бюро ячэек выстаўляла сьпісы каго бюро рэкамэндуе абраць на конфэрэнцыю, (калі спосаб рэкамэндацыі мэтадазгодзен пры выборах бюро, дык зусім непатрэбным гэта зьяўляецца пры выбары дэлегатаў на конфэрэнцыі).

Драбкін.

Количество и качество.

Мы обращаем внимание читателей на заметку нашего юнкора „Упало качество», помещенную в отделе жизни рабочей молодежи. Товарищ затронул важный и злободневный вопрос.

На „Днепровской Мануфактуре“ в погоне за количеством совершенно забывается качество продукции.

Товарищи из за кустарника не видят леса.

Днепровская Мануфактура — не исключение. На многих предприятиях можно встретить такую картину. Комиссия следящая за качеством продукции, отметила, что спички, изготавливающиеся белорусской спичечной фабрикой „Красная Березина“ самые плохие по своему качеству.

Как на „Днепровской Мануфактуре“, так на „Березинеи“ десятках подобных предприятий работает много молодежи.

В этом номере газеты мы печатаем выдержки из специального указания ЦК ВЛКСМ по вопросу об участии комсомольских организаций в борьбе за строжайший, „зверский“ режим экономии и в борьбе за качество продукции.

Каково положение на местах?

Что предпринимают комсомольские организации?

Надо поставить дело так, чтобы трудящаяся молодежь была застрельщиком, как режима экономии, так и борьбы за качество, не на словах, а на деле, в каждодневной работе

История одного отрыва.

«СЛУШАЛИ: Об исключении из КСМ Шугаева за отрыв, пьянство и хулиганство.
ПОСТАНОВИЛИ: Исключить».

Эта протокольная выписка из комсомольского Райкома была прислана в Могилевский Окружкоммол.

Райком исключил комсомольца Шугаева, крестьянина бедняка, 18-ти летнего парня, 10-ти месячного „комсомольского стажиста“.

Сухо и твердо говорила эта выписка:

„Исключить за отрыв, хулиганство и пьянство“.

Но конфликтная комиссия Окружкоммола мягче подошла к этим „твердым“ и веским словам.

Может быть, исправится. Исключать рано—решила КПК.

Бюро Окружкоммола подтвердило ее решение...

На завтра утром, небольшое личное письмо от Окружкома несла почта на имя Ивана Шугаева.

* * *

Через месяц пришел длинный, по слогам сложенный „Атвет Укоужкомолу, ат таварыша Шугаева Ивана“.

На большом обрывке бумаги, карандашем вывел Шугаев:

„Я часта пасищал сабрания, а раз нипашел. Тагда присылает секратар ячейки павесточку, а у павесточки гаварит: „хочешь хади, хочеш не хади, а склочить—сключим“... Тады я нипашел. А што я фулиганил, ну канешно раз пришлося чарочку нагнуть, но я звиняюсь, а у камсамоле всей душою хачу быть. Як решите, передайте Райкому, Райком ячейке, а ячейка мне, а так я не пайду, па тому што яны мне сключили, а у камсамоле хачу быть“.

А назавтра Райкоммол „на номер отвечая“, снова настаивает:

„За пьянство, хулиганство и абсолютный отрыв ходатайствуем об исключении Шугаева. Мы считаем, что его нецелесообразно держать в наших рядах“.

* * *

Таковы два ответа:

Один—Шугаева, желающего „всей душою быть в комсомоле“, другой—Райкома, считающего „нецелесообразным держать его в наших рядах“.

О целесообразности перевоспитать Шугаева—малограмотного, отсталого бедняка, еще молодого по возрасту и комсомольскому стажу,—можно, я думаю, с Райкоммолом поспорить. Нам не важен „абсолютный отрыв“, о котором так громко и уверенно дважды заявляет Райкоммол.

После первого непосещения собрания, секретарь ячейки не соизволив лично побеседовать с Шугаевым, шлет ему повестку: Хочешь ходи, хочешь не ходи, а исключить—исключим“.

Что после этого оставалось делать неграмотному, забитому комсомольцу Шугаеву? Он не из тех, кто с повесточкой в руках“ пойдет в Райкоммол, чтобы там показать, как развит комсомольский бюрократизм в его ячейке: он не из тех, кто пойдет на бюро ячейки, чтобы сказать:

„Не повестками, а раз'яснением и убеждением следует привлекать не посещающих собрания комсомольцев“.

Он этого не сделал, он из двух данных ему советов выбрал самый легкий—не пойти, и не пошел.

А если не пошел на собрание, значит пошел к „друзьям“, а здесь и „чарочка“ и, „фулиганство“ и все отсюда последствия, несмотря на то, что «у комсомоле всей душою хочется быть“.

* * *

Такова история Шугаевского отрыва. КПК и Окружкоммол учли эту историю и оставив Шугаева в комсомоле, вынесли ему строгий выговор с занесением в личное дело за пьянство.

Из этой истории пусть сделают вывод деревенские ячейки и Райкомы в летний период, когда комсомольца лето и полевая работа временами перетягивает от ячейковых собраний.

Л. Колев.

Моладзь на грамадзкай працы.

Трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на працу ў коопэрацыі. Быць проста сябрам коопэратыву—яшчэ мала: трэба быць сьвядомым і актыўным сябрам яго.—Комсамол Бабруйшчыны ў камітэтах узаемадапамогі.—160 маладых хлапцоў і дзяўчат Барысаўшчыны выбраны ў фабзаўкомы

Быць актыўным сябрам коопэратыву.

Якім чынам праводзіць працу ў коопэрацыі?

Галоўная задача месьцішча ў тым, каб дамагчыся аўторытэту ў сялянства, каб высунуцца на актыўную коопэратыўную працу. Шмат хто з вясковых комсамольцаў, вычытаўшы дзе-небудзь, што комсамолец павінен агітаваць за ўступленьне ў коопэратыў, пачынае крычаць праз усю вуліцу, што вось вы несьвядомы, не ўступаеце ў коопэрацыю" і г. д., і г. д. А калі селянін спытае ў яго: „А сам ты сябра коопэратыву?",—дык хлапец стане ў тупік і чэша патыліцу, шукаючы апраўданьня. Гэткі няглыбокі погляд часта сустракаецца ў вясковых ячэйках.

Гэткім чынам, першая задача (гэта, зразумела, датычыцца да гаспадарча самастойных хлопцаў) зьяўляецца ў тым, каб перш за ўсё самому быць проста сябрам коопэратыву яшчэ мала. Трэба быць сьвядомым і актыўным сябрам яго. Неабходна, каб комсамолец—сябра коопэратыву ўважліва сачыў за працай праўленьня, прыкмячаючы ўсе яго недахопы, папярэджваючы альбо выкрываючы ўсе магчымыя быць злоўжываньні. Калі ў гэтым напрамку будзе што-небудзь зроблена, аўторытэт яго адразу падымецца і з ім будуць лічыцца.

У тых мясцох, дзе комсамольцы актыўна ўдзельнічаюць у жыцьці і працы мясцовага коопэратыву, можна ўглядаць вельмі характэрнае зьявішча. Гэта—стычка дзьвюх сіл, дзьвюх процілеглых лягераў. З усіх вясковых організацый коопэрацыя самае карыснае месца для кулака, і вось чаму ў коопэрацыі мы можам угледзець асабліва востра выяўленую барацьбу паміж новым і старым, паміж моладасьцю, энэргіяй комсамольцаў і хітрасьцю і практыкай кулакоў.

Як мы ўжо казалі, адзін са шляхоў да непасрэднай коопэратыўнай дзейнасьці знаходзіцца ў заваёве аўторытэту праз актыўны ўдзел у вырашэньні ўсіх пытаньняў, што зьвязаны з коопэратывам.

Другі шлях заваёваў аўторытэту знаходзіцца ў здабычы коопэратыўных ведаў і выяўленьня іх у працы. Першай ступеньню, якая вядзе да гэтых ведау, зьяўляецца коопэратыўны альбо сельска-гаспадарчы гурток. Сельска гаспадарчыя, а ў асаблівасьці коопэратыўныя гурткі сустракаюцца не асабліва часта. І калі пытаешся аб прычынах, якія пашкодзілі яго ўтварэньню, заўсёды атрымоўваеш адзін адказ: „Няма грошай, няма кіраўнікоў, няма часу" і г. д. Бязумоўна, гэткі адказ не зьяўляецца апраўданьнем па той прычыне, што дзеля ўтварэньня коопэратыўнага гуртка не патрабуецца ні вялікага ліку грошай, ні асабліва шмат часу. Прасьцей за ўсё—дык гэта ўтварыць пры хатах-чытальнях коопэратыўныя куткі. Са сродкаў, вызначаных на літаратуру, крыху можна скарыстаць на коопэратыўную літаратуру, якая і прапрацоўваецца шляхам гутарак, зразумела, пры найблізшым удзеле загадчыка хаты-чытальні альбо настаўніка.

Школы сялянскай моладзі павінны аддаць значную частку часу дзеля прапрацоўкі коопэратыўных пытаньняў як тэорытычнага характару, гэтак і практычнага, галоўным чынам, на аснове працы мясцовай коопэрацыі.

С. Пшэжэцкі.

Комсамольцы ў камітэтах узаемадапамогі.

(Бабруйшчына).

З комсамольцаў мы маем па вокругу 173 члена камітэтаў узаемадапамогі, а іх старшынь 24 чалавекі, сакратароў 29 і ўпаўнаважаных 110 чал. Павялічэньне ў параўнаньні з перавыбарамі мінулага году на 50 чалавек.

Есьць комсамольцы, якія працуюць добра, якія могуць быць прыкладам. Так, напрыклад, у Стрэшынскім раёне ў двух камітэтах комсамольцы старшыні. Пры выбарах сяляне казалі:

— Пабачым, як комсамольцы здолеюць працаваць.

— Пабачым —сказалі і комсамольцы.

І вось яны сваетэрмінова сабралі членскія ўзносы, закупілі дзьве саламарэзкі, адну льнопрадку і яшчэ зробілі нямала карыснага. Вядома, сялянства такой працай здаволена.

Комсамольцы Ляскавіцкай ячэйкі —члены камітэта купілі саламарэзку, знашлі грошы на закупку малатарні.

У Пірэвіцкім камітэце старшыня і сакратар зьяўляюцца комсамольцамі, яны організавалі арцель, дагаварыліся з коопэрацыяй наконт коопэрыраваньня беднаты.

Ліпінскі камітэт, дзе старшыня комсамолец, організоўвае лесарубачныя артэлі, закупілі некалькі саламарэзак, прыступілі к коопэрыраваньню беднаты.

Работа, як бачым, вядзецца, праўда, яшчэ мала, але там, дзе работаюць, там і будуць работаць і будуць пашыраць гэту працу.

Но маюцца яшчэ і недахопы, якія ня трэба дапускаць нідзе. Былі выпадкі, што іншыя комсамольцы, напрыклад, у Буда-Кашалеўскім раёне, прасілі зьняць іх з работы ў камітэтах, мотывіруючы свае прозьбы тым, што праца там бясьплатная. Такія мысьлі маюцца яшчэ у многіх комсамольцаў.

Ясна, што з такімі настроямі працы добрай ня зробіш; так, напрыклад, старшыня Слаўкавіцкага камітэту, Глускага раёна, беспартыйны селянін піша заяву, у якой кажа: „Я і ў ЦК напішу, что нашы комсамольцы не працуюць нічога, ня трэба іх у другі раз выбіраць".

Вядома, што такія хібы трэба з корнем выжываць з працы нашых ячэяк, бо яны не прынясуць ніякай карысьці, а будуць працаваць у пустую.

Н. Яндульскі.

Моладзь у фабзавмясцкомах.

(Барысаў).

Перад перавыбарамі фабзавмясцкомаў, сярод рабочай моладзі была праведзена вялікая кампанія па растлумачэньні.

У выніку--моладзь актыўна ўдзельнічала на перавыбарах. Па справаздачам фабзавмясцкомаў мы мелі па 2-3 выступленьні з ліку моладзі на кожным прадпрыемстве.

Калі пры апошніх перавыбарах мы мелі ўцягнутай ў фабзавмясцкомы моладзі 71 чал., дык ў сучасны момант мы маем 160 чал. маладых хлапцоў і дзяўчат—сяброў фабзавмясцкомаў, з якіх беспартыйнай моладзі—91 чал. (пры мінулых перавыбарах мелі толькі 5 чал.).

Моладзь высунута і на кіраўніцкую працу—(старым фабзавмясцкомаў—17 чал.) у працу рознавыглядных камісій.

У далейшым перад комсамольскімі ячэйкамі стаяць на чарзе важныя заданьні:

Узмацненьне дапамогі і кіраўніцтва высунутымі таварышамі, 100 проц. уцягненьня ўсёй высунутай моладзі ў профгурткі дзеля профвыхаваньня.

А. Паднос.

Насьцэнныя газэты і рэжым экономіі.

Нашы дасягненьні.

На мясцовым матар'яле — растлумачваем лёзунг «рэжыма экономіі.

(Буда-Кашалёўскі раён).

Пры нашай ячэйцы супольна з партыйнай ячэйкай выдаецца штомесячная насьцэнная газэта „Селькор".

Дапішчыкаў у нашай сьцэнгазэце —19 чалавек, з якіх 8—комсамольцаў, 3—партыйцы і 8—беспартыйных.

Сьцэнгазэта выходзіць пры актыўным удзеле гуртка „прыхільнікаў газэты". Амаль усе дапішчыкі газэты —сябры гуртка. Да ўдзелу ў газэце прыцягнут агроном.

Ў 5-ым, апошнім нумары насьцэннай газэты побач з звычайнымі аддзеламі: перадавіцай, савецкім будаўніцтвам, сельска-гаспадарчым аддзелам, мы ўвялі аддзел: „Барацьба за рэжым экономіі". Растлумачыўшы ў перадавіцы сутнасьць гэтага лёзунгу мы аддзел пабудавалі выключна на мясцовым матар'яле. У аддзеле былі 3—допісі. Аб тым, што лясьная камісія без карысьці дае рэзолюцыі на атрыманьне лесу, што пажарная машына не беражэцца толкам, аб дасягненьнях ў рэжыме экономіі: комсамольцы каля нардому пачысьцілі падворак і гэтым грошы дзяржаве зьберэглі. Аддзел гэты значна зацікавіў чытачоў. На раённай выстаўцы насьценных газэт ён прыцягваў да сябе ўвагу сялян.

Адным з значных недахопаў нашых тое, што ніяк аддзелу „жыцьцё моладзі" не наладзім у газэце, мала пішуць комсамольцы аб жыцьці ячэйкі і г. д.

Далейшымі нашымі заданьнямі—наладзіць аддзел „жыцьцё моладзі" газэце, павесьці сталую працу з нашымі сьцянкорамі і наогул узмацніць працу гуртка „прыхільнікаў газэты", вывешваць газэту ня толькі ў нардоме, але і ў канцэлярыі сельсавету, ад чаго больш сялян будуць чытаць яе і павялічыць колькасьць дапішчыкаў газэты за лік дарослых сялян, а таксама беспартыйнай моладзі.

Міхась Рабіновіч.

Хозяйственники—ближе к газете!

„Профшкольский луч"—освещает недочеты в производстве.

(Минск, об'единенная профшкола).

Через нашу стенгазету „Профшкольский луч"—мы проводили кампанию за режим экономии. В последнем номере, в отделе „Школы и ячейки" мы выпустили хороший, небольшой отдельчик „За экономию", где отметили, что:

— нужно-бы было использовывать стружки в деревообделочном цехе—для топлива;

— наблюдается неполная нагрузка мотора, (хотя он и действует) и „полный отдых" станков;

— неаккуратно мы начинаем работу, с опозданием на полчаса и больше...

В дальнейшем мы еще больше бы расширили этот отдел, но, как говорится, часто наши предложения „идут в пустую".

Некоторые администраторы стенгазету считают простой картинкой или игрушкой.

Вот факт: когда член редколлегии предложил заведующему металлическим цехом ответить на заметки,—последовал ответ:

А я причем? Какое мне дело до вашей газеты?

Для ясности, приведем краткое содержание заметок.

„Не все гладко".

В металлическом цехе—много недочетов, а именно:

1) Ненагруженность мастеров.

2) Кузнец свободно может выполнить какую-либо работу,—в результате не было бы в слесарном цехе „отдыхающих".

3) В модельном отделении—нет учеников.

4) Неполная нагрузка токарных станков (впустую тратится электрическая энергия).

5) Нужно урегулировать рабочий день учеников и мастеров. Работа начинается с опозданием на полчаса и больше.

6) Слаба оплата инструкторам, в результате чего—не заинтересованность в работе.

А вот и вторая заметка: „Дайте ручки и замки", где стенкор жалуется на отсутствие замков, в результате чего—пропажа частей работы, недохват ручек (а пилить без них—значит нажить „кровавые мозоли).

Мы спрашиваем после этого—для чего-же помещать вообще заметки в газету?

Если кто и прочтет их, то замечая, что никаких результатов они не дают—отмахнется рукой.

Хозяйственники, администрация школы,—ближе к профшкольской газете!

И. М.



„Трагэдыя" юнкора.

Так дарагія чытачы. Добра", вось вам, падыймаецеся з ложка раніцай, прымаецеся за гарбату, мыецеся, затым гарбату п'еце, закурыце і ўрэшце чытаеце газэту (калі вы яе дагэтага ня скурыце).

Але... добра вам, таварышы. Не жыцьцё ў вас, а масьленіца.


А вось нашаму брату-юнкору—цяжка.

Рэдакцыя—гэта хрономэтрычны інструмант, які выяўляе цярплівасьць юнкораў, а патрабуе яна напісаць „аб больш важных фактах", а не аб якіх там небудзь дробязях.

А рэжым экономіі? Ці ня ведаеце вы, што такое рэжым экономіі? Рэжым экономіі гэта тое... усё роўна, што жырсыцьвяны зажым. Так. Асабліва для нашага брата-юнкора. Дык вось, прымаючы пад увагу рэжым экономіі я буду казаць вельмі коратка.


Напісаў я артыкул: „Ці скора расплывецца рэлігійны дурман, ці бяз портак у нардоме". Праз тыдзень чытаю ў паштовай скрынцы: „Не пойдзе", пішэце «аб больш важных фактах». А дзе іх возьмеш—больш важных фактаў, з пальца высасаць ці што?

Дык вось, каб не адстаць ад сусьветнай рэволюцыі, бегаю, як угарэлы і шукаю ўважныя факты. Бегаеш, бегаеш, а ў выніку без падашвы, а на языку мазоль.




Бабы сьмяюцца.


— Ачумеў ты ці што? Вось Паўліна мужа мае і па што тут розная цемната?




Іду далей. Дай, думаю, на шкурных справах згуляю, схажу ў ячэйку ЛКСМБ і заметка ўжо складываецца.




„Ні ячэйка, а відавочнасьць адна, ці як сакратар валакіту разводзіць".




Заходжу і пытаюся:—а як, таварышы ў вас на конт сяброўскага ўзносу? Колькі месяцаў у райком не адсылалі?



На мяне глядзяць, як на безнадзейнага ідыёту і кажуць. Сьпазьніўся таварыш. Ячэйка падцягнулася на „яць".



— Ідыёты лаюсь я пра сябе і расчараваны цягнуся далей.



Эх, цяжкае жыцьцё юнкора.




Ів. К—в.









На Березине..

(Из блок нота отпускника)

Фабрика прекратила работу 29 го мая и огромная масса рабочих в 1.200 человек распущена на отдых.

Еще задолго до приостановки фабрики вопрос о проведении отпуска горячо обсуждался молодежью фабрики.

Строились красивые планы (экскурсия в Ленинград, Москву, Иваново-Вознесенск), составлялись списки желающих поехать, но фабрика приостановила работу несколько неожиданно и все планы были, таким образом, разрушены.

Молодежь отправилась кто куда: слабые, уставшие—в „дом отдыха", другие—раз'ехались по деревням.

Я с первым-же пароходом отправился вниз по реке Березине, в местечко Чернявку.

В Чернявке.

Итак, я в Чернявке, тяжело подымаюсь по крутому берегу. Кругом срубленный лес, бревна и бревна.

Еврейское местечко—одна единственная улица, огромное море горячего желтого песку.

Местечко Чернявка—центр больших лесных разработок,—широкий хозяйский лесбеловский размах. Сотни рубщиков, сплавщиков, десятки приемщиков, бухгалтеров, кассиров. На лесных разработках заняты все с окружающих деревень. В местечке, по вечерам—шум, споры. По воскресеньям—после получки, грандиозные попойки. Пьют свое крестьянское: (самогон), „русская горькая" еще не заняла здесь подобающего места.

Весело в Чернявке. Понаехали инженеры, техники. Будет большое строительство, через реку Березину мост ставить будут.

Весело и шумно в Чернявке.

Собрание под жгучими лучами.

На утро приходят двое.

— „Хавер Львов, мир зайнен цу дир гекумен" *).

В чем дело?

Оказывается, сегодня собрание ячейки комсомола. Поэтому я должен делать доклад о „хозяйственных затруднениях, событиях в Англии или о чем нибудь другом".

„Начинается"—подумал я и тяжело вздохнул.

Кое-как об'ясняю ребятам, что сегодня я не могу доклад делать, не подготовлен, нет материала, что через пару дней я, пожалуй, сумею. Ребята уходят.

Суббота. Солнце жжет немилосердно. Жарко. Идешь в лес. Там сегодня собрание.

Молодежь собралась скоро. Большинство девушек, подростков, пришли и дети.

Расселись на опушке леса, на травке, в тени от горячего июньского солнца.

Слушают доклад о печати. После доклада дельные вопросы.

Ячейку-бы надо организовать

Молодежи в местечке много. Ребята в большинстве своем грамотные, настойчиво рвутся к общественной жизни, к работе.

Ячейки комсомола в местечке нет, есть ячейка в сельсовете, в Озядчицах, за 5 верст.

Ребята жалуются. Ругают, зло и крепко ругают Борисовский деревенский Райкомол.

*) „Товарищ Львов, мы к тебе пришли".

И в самом деле. Есть ребята, вступившие в КСМ в 1923, 24 и 25 году—билетов нет; неизвестно комсомольцами считать себя иль нет.

Все условия для создания в местечке крепкой, комсомольской ячейки—есть.

Народ здесь трудовой, молодежи тяжело и трудно приходится хлеб зарабатывать.

Работают по перевозке леса, по сплаву.

Почему же не создать здесь комсомольской ячейки?

А дети. У них такое безконечное желание стать пионерами! На головках у всех красные платочки с кимовскими значками. Мы хотим создать здесь пионер-отряд, кто нам поможет?

В Борисовском деревенском райкомоле есть пионер. работник, когда то чернявский парень, а в Чернявку никогда ни заглянет.

Надо и можно создать здесь пионерский отряд, оформить.

И еще: библиотеки нет, нет книг. Шеф—Борисовский Комхоз,—молчит, о шефе ни слуху, ни духу. А ведь шефа обязанность—оказывать культурную помощь подшефу.

Молчит, спит шеф

* * *

Хорошо в Чернявке. Здесь—все для того, чтоб отдохнуть и поправиться.

Чистый, лесной воздух, глотай, втягивай его в себя полной грудью.

Вода, чистая прозрачная.

Солнце... У...у...у как жгет и ласкает спины.

И песок—раскаленная масса, аж ноги в сандалиях горят.

Хорошо.

За две недели тут отдохнешь, как полагается

С. Львов.

Быт вясковай моладзі.

Комсамолец у сям'і. Ці магчыма наладзіць узаемзадносіны комсамольца з бацькамі.—Плямы быту і іх зжываньне.—Няма пэўнага матар'ялу дзеля правядзеньня вечарынак.

Цяжка, але магчыма.

У № 63 «Чырвонай Зьмены» т. Брэзгуноў закрануў даволі жыцьцёвае пытаньне „Бацька і сын". Адно няверна у тав. Брэзгунова, што паміж бацькам і сынам асабліва комсамольцам акрамя працівалегласьці ні[чога] магчыма нічога наладзіць, бо раз бацька прасякнуты старым поглядам на жыцьцё, дык тут ужо прарабіць нічога немагчыма.

Парада Брэзунова комсамольцу, каб самому не папасьці пад бацькоўскі ўплыў як найхутчэй аддзяліцца ад бацькі і жыць самастойна—не адпавядае нам.

Чаму яшчэ існуе працівалегласьць паміж бацькам і сынам? А часьцяком бывае, што сын комсамолец глядзіць з высака на бацьку. Есьць такія, што цураюцца гутаркі з бацькамі:—бацька ўсё роўна не зразумее. А шмат яшчэ ёсьць бацькоў, якія ня ведаюць нават, куды гэта іх сыны ходзяць па нядзелях што яны там робяць чаму яны там вучацца. Мала гэтага, ёсьць яшчэ комсамольцы абібокі, гультаі на гаспадарцы, як пісаў т. Ц. Д. Вось тут увесь корань зла. Вядома, што гэткі комсамолец праводзіць свайго ўплыву ў сям'і ня зможа і гэткаму комсамольцу бацька й скажа: „яйца ня вучаць курыцы".

Комсамолец павінен перавыхаваць бацьку, паказаць на справе сваю праваты. Ня трэба задзіраць носу перад бацькам з сваім розумам, трэба памаленьку наступаць на яго з кніжнымі ведамі, трэба больш бацьку чытаць: «Плуг» „Беларускую Вёску" і бацька з часам будзе ўвесь на тваім баку. Будзе цябе паважаць, нават пытаць дзе, як і што пасеяць і нават хваліцца табою будзе суседзям.

Вось прыклад з маім бацькам пры маім уступленьні ў комсамол: я з ім быў, як кажуць, на нажох. Памаленьку я пачаў угаварваць бацьку, пачаў шмат гутарыць з ім, чытаць газэты і вось ужо ў гэтым годзе бацька ня гледзячы на свой 65-гадовы ўзрост перад пачаткам пасяўной кампаніі хадзіў сам за 10 вёрст да агронома за патрэбнымі парадамі.

Вывад: паміж бацькам і сынам сумесная жыцьцё магчыма.

Трэба ўгаварваць бацьку памаленьку, ня гарачыцца, а галоўнае ня словамі, а справаю,—бацька магчыма з пачатку і ня будзе спачуваць табе але хутка пяройдзе на твой бок.

Паўтараю, гэта марудна, але магчыма.

Міхась Шпілеўскі.

З кніжкай пад пахай.

(Па пытаньню, зачэпленаму Брэзгуновым).

